# [Аквітызм і пролетарскае паняцьце прыгожага ў поэзіі]

Кожны чалавек мае тое ці іншае паняцьце аб прыгожым, вялічавым, узвышаным, словам, аб усім тым, што зазвычай лічыцца прадметам мастацтва. Пролетарыю таксама патрэбна мець гэткае паняцьце. Пролетары таксама павінен усьведам[ляць], што яму лічыць за прыгожае. Вядома, што гэткае ўсьведамленьне магчыма толькі тады, калі ёсьць тое, што можна лічыць прыгожым. Для паняцьця патрэбна аснова, падстава рэальная. Іначай утварэньне яго немагчыма. Паняцьце вялікага чалавека немагчыма без наяўнасьці ў жыцьці вялікіх людзей, да якой–бы групы яны не належалі. Так яно магчыма і ў дачыненьні паняцьцяў эстэт[ычнага] парадку.

Паняцьці ўтвараюцца або шляхам адцягненьня ад рэальнага факту, або шляхам аналізу адзінкавых рэальных фактаў і сынтэзу некаторых іх элемэнтаў, або шляхам умазаключальн[ага] адцятага разважаньня. Ці–ж можна ўжо ўтварыць прол[етарскае] паняцьце прыгожага ў поэзіі? Для гэтага патрэбна наяўнасьць прыгожага ў пролет[арскай] поэзіі. Ці ёсьць яно? І ёсьць, і няма. Калі ўзяць творы ў цэлым, якія пролет[ары] лічыць сваімі, то знойдзем і прыгожыя. Калі–ж іх разгледзім па тых сустаўных элемэнтах, з якіх яны складаюцца, то ўгледзім, што яны не заўсёды прыгожыя.

Лір[ыка] N. прыгожая. На падставе гэтага ў нас ужо можа быць паняцьце „прыгож[ае], як лір[ыка] N.“. Адсюль паўстае патрэба азначэньня л[іры]кі N. Якая яна, што прыгожая? Іначай кажучы, патрэбна выявіць, па чыйму вобразу і пад[абенству] утворана гэта лірыка. (Бо калі мы якую новую зьяву азначаем, што яна такая, як N–[ава] лір[ыка], гэтым мы кажам, што яна падобна на яе, што яна ўтворана па яе вобразу. Адгэтуль магч[ыма] пыт[аньне]: па чыйму вобразу гэта лірык[а] утворана? Гэта значыць, што мы прыйм[аем] яе за невядомае, будзем азначаць яе вядомым да яе зьяўленьня на сьвет. Сынтэз гэтых азначэньняў і будзе азначэньне яе.) Дапусьцім, некаторы *x* гэт[ай] лір[ыкі], як куп[алаў]скі, а некат[оры] *y*, як Гар[уно]вы, а некаторы, як Баг[дановіча]вы, а некат[оры], як народ[ны], а некаторы самастойны, асабовы. Тады мы можам сказаць, што лір[ыка] N. рознахарактарная ці шматхарактарн[ая], азн[ачана] як адзінства міл[агучнасьці], зад[уменнасьці] і вобр[азнасьці] і назв[ана] гэта аквітычн[ай].

*[1926]*